**24.** Дадзены дзеясловы:

*1) прасіць; 2) перапісаць; 3) падрасці.*

Пры змяненні якіх слоў адбываецца чаргаванне свісцячых гукаў з глухімі шыпячымі?

**А)** няма правільных адказаў. **Б)** усе дзеясловы. **В)** 1, 2.
**Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**25.** Якое(-ія) словазлучэнне(-і) з дадзеных запісана(-ы) правільна:

*1) меншы аднагодкаў; 2) самы выразны гук;*
*3) больш ярчэйшае святло; 4) найразумны чалавек.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 4. **Г)** 2. **Д)** 3, 4.

**26.** Лагічнае розумазаключэнне, у якім з двух дадзеных суджэнняў атрымлівацца трэцяе (вывад), называецца …

**А)** маналог. **Б)** сілабіка. **В)** дыспут. **Г)** сілагізм. **Д)** развязка.

**27.** Вучням неабходна было выбраць з прапанаваных слоў толькі тыя, якія маюць марфалагічнае падваенне. Былі выпісаны словы:

*1) мільённы; 2) палоззе; 3) насценны; 4) аддушына.*

Якое слова вучні выпісалі памылкова?

**А)** усе словы выпісаны правільна. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**28.** У Чылі на помніку нашаму земляку Ігнату Дамейку, які некаторы час быў рэктарам універсітэта ў Сант'яга, высечаны словы …

**А)** Дзякуй за веды. **Б)** Твая слава прадоўжыцца ў вучнях.
**В)** Вялікаму Вучонаму. **Г)** Вялікаму Асветніку.
**Д)** Няма прарокаў у сваёй Айчыне.

**29.** Гэты знак прыпынку, як сведчаць навукоўцы, упершыню з'явіўся ў кнізе на рубяжы XV і XVI стагоддзяў. Яго ўвёў венецыянскі выдавец Альд Мануцый. Пра які знак прыпынку ідзе гаворка?

**А)** пра коску. **Б)** пра кропку. **В)** пра працяжнік.
**Г)** пра шматкроп'е. **Д)** пра двукроп'е.

**30.** Хто з беларускіх мастакоў слова сказаў: *"Верш значны не гукам, які чуваць, пакуль чытаецца, а рэхам, якое ён утварае, калі адгучыць."*

**А)** Пімен Панчанка. **Б)** Максім Танк. **В)** Уладзімір Ліпскі.
**Г)** Алесь Звонак. **Д)** Алесь Разанаў.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218; тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53;
e-mail: info@bakonkurs.by; http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 13. Тыраж 5600 экз. г. Мінск. 2010 г.

# Конкурс па беларускай мове
# «БУСЛІК-2010»

*Чацвер, 18 лютага 2010 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 11 класа

**1.** Якую літару неабходна ўставіць замест пропускаў у словах: *ко..дра, ка..нер, ла..ка, жора.., а..тобус.*

**А)** л. **Б)** в. **В)** й. **Г)** ў. **Д)** ф.

**2.** Выберыце правільна напісанае слова.

**А)** феерверк. **Б)** фейерверк. **В)** фейверк. **Г)** феерверх. **Д)** феерверг.

**3.** Як перакладаецца на беларускую мову рускае слова ***кочерыжка***?

**А)** качарга. **Б)** палка. **В)** выварацень. **Г)** тарка. **Д)** храпка.

**4.** Хто з пісьменнікаў меў літаратурны псеўданім Максім Беларус?

**А)** Максім Лужанін. **Б)** Янка Лучына. **В)** Максім Гарэцкі.
**Г)** Максім Танк. **Д)** Міхась Зарэцкі.

**5.** Якія знакі прыпынку неабходна паставіць на месцы пропускаў у сказе:
*Каб належным чынам весці гутарку _ трэба перш за ўсё ўмець слухаць таго _ з кім гаворыш _ бо калі сам не ўмееш слухаць _ то другога не прымусіш.*

**А)** чатыры коскі. **Б)** дзве коскі, два працяжнікі.
**В)** дзве коскі, двукроп'е, коска. **Г)** коска, працяжнік, дзве коскі.
**Д)** працяжнік, коска, двукроп'е, працяжнік.

**6.** Якая назва дня тыдня этымалагізуецца як "*другі дзень*"?

**А)** нядзеля. **Б)** панядзелак. **В)** аўторак. **Г)** серада. **Д)** чацвер.

**7.** Якія прыслоўі ў словазлучэннях неабходна напісаць разам:

*1) узяць сабе (за) прыклад; 2) ісці (з) боку; 3) працаваць (у) меру; 4) папрасіў (у) абмен; 5) выступіць (на) паказ.*

**А)** усе прыслоўі. **Б)** усе прыслоўі, акрамя 4. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4.

**8.** Выберыце з дадзеных назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку:

*1) дровы; 2) вілы; 3) поцемкі; 4) імяніны; 5) зажынкі; 6) вусны.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 1, 2, 5. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4, 6.

**9.** Вызначце з прыведзеных правільна напісаныя словы:

*1) мноства; 2) харацтво; 3) слуцкі; 4) ткатскі; 5) рыбатскі.*

**А)** няма правільна напісаных слоў. **Б)** усе словы напісаны правільна.
**В)** 1, 3. **Г)** 1, 2, 3. **Д)** 2, 4, 5.

**10.** Закончыце народную прыказку: *Найсмачнейшы хлеб …*

**А)** з новага ўраджаю. **Б)** з варэннем. **В)** ад сваёй працы.
**Г)** ад бабулі. **Д)** свежай выпечкі.

**11.** Як называецца загадка, у якой толькі гаворыцца пра зашыфраванае слова і неабходна ўставіць або выкінуць указаную літару ці склад, каб прачытаць адгадку?

**А)** шарада. **Б)** лагагрыф. **В)** метаграма. **Г)** анаграма. **Д)** красворд.

**12.** Пра якую народную прыкмету ўзгадаў Уладзімір Караткевіч у аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”: *“Ніводнай птушкі-пасмяюхі не траплялася нам па дарозе, а гэта была дрэнная прыкмета: павінен быў пайсці …”*

**А)** цяглы мокры снег. **Б)** кароль на паляванне. **В)** паштовы цягнік.
**Г)** дзень на клопаты. **Д)** цяглы начны дождж.

**13.** Выберыце з прыведзеных правільна напісаныя словазлучэнні:

*1) пасмяяцца са сваіх няўдач; 2) вадзіць па шкле;*
*3) спазніліся з-за дажджу; 4) восем адзінаццатых кіламетра;*
*5) здольны да навук; 6) пяць вялікіх акон.*

**А)** усе словазлучэнні. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1, 2, 5.
**Г)** 2, 4, 5. **Д)** 3, 6.

**14.** Якое значэнне мае выдзеленае слова ў словазлучэнні ***саундрэк*** *да кінафільма*?

**А)** песня. **Б)** прыпеўкі. **В)** цітры. **Г)** мелодыя. **Д)** рэклама.

**15.** Якому слову ў сучаснай мове адпавядае старажытнае агульнаславянскае словазлучэнне *“сего лета”*?

**А)** сёння. **Б)** сёлета. **В)** сягоння. **Г)** леташні. **Д)** летам.

**16.** Якім членам сказа з’яўляюцца выдзеленыя словы ў сказе: *Ноч стаяла* ***светлая і бязветраная****.*

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** азначэннем.
**Г)** дапаўненнем. **Д)** акалічнасцю.

**17.** У якіх словах замест кропак напішаце літару ***ь***:

*1) піл..нуе; 2) с..ведка; 3) камен..чык; 4) с..вята; 5) дз..мухае.*

**А)** 1, 3, 5. **Б)** 2, 3, 4. **В)** 2, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**18.** У якіх прыкладах з дадзеных напішаце часціцу ***не*** разам:

*1) (не)абсяжны прастор; 2) зусім (не)знаёмы вандроўнік;*
*3) нікім (не)заўважаны след; 4) (не)горшы за аднакласніка;*
*5) нікуды (не)ехаць.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 2, 3, 4. **Г)** 3, 5. **Д)** ва ўсіх прыкладах.

**19.** У якіх словах неабходна напісаць літару ***я***:

*1) ве..р; 2) ..гіпцяне; 3) вы..віць; 4) зел..навокі; 5) пам..ць.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 4. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**20.** Хто з беларускіх мастакоў слова з’яўляецца аўтарам вершаваных радкоў:

*І тчэ, забыўшыся, рука,*
*Заміж персідскага ўзору*
*Цвяток радзімы васілька.*

**А)** Янка Купала. **Б)** Якуб Колас. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Паўлюк Трус. **Д)** Пятро Глебка.

**21.** У якіх словах з дадзеных націск падае на першы склад:

*1) індэкс; 2) дэфіс; 3) вудзіць; 4) крупяны; 5) правапіс.*

**А)** 1, 3, 5. **Б)** 1, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 5. **Д)** 3, 4.

**22.** Выберыце правільныя варыянты з прыведзеных словазлучэнняў:

*1) расказаць аб дзядзьку, аб Віцю;*
*2) успомніць аб дзядзькі, аб Віці;*
*3) не забыцца аб дзядзьку, аб Віці.*

**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**23.** Выберыце з прапанаваных сродкі тэкставай сувязі: *1) паўтор слоў і словазлучэнняў; 2) сінтаксічны паралелізм; 3) пабочныя словы і словазлучэнні; 4) парцэляцыя; 5) злучнікі; 6) няпоўныя сказы.*

**А)** усе варыянты. **Б)** усе варыянты, акрамя 4. **В)** 1, 3, 5.
**Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 5.